# Сучасная беларуская літаратура

## [Урыўкі з уводзінаў у курс лекцый]

### [З першай лекцыі, 27 траўня 1930 г.]

#### Азначэньне сучаснае беларускае літаратуры

5. Літаратура як ператварэньне матар'яльнага ў ідэальнае.

Літаратура як працэс, а ня рэч. Законы руху як формы быцця матэрыі. Твор як зьняты працэс (вынік і зьнятая прычына ў ім. Літаратурны працэс у папярэчным разрэзе — як працэс тварэньня–адтварэньня (твор — другі, сярэдні тэрмін у ім між крайніх: першага — творцы–аўтара ды трэйцяга — адтваральніка — чытача й крытыка, чытача–крытыка). Літаратурны працэс у наўздоўжным разрэзе — як зьвязнасьць і цягласьць (дадатная або адмоўная — праз антытэзу, адпіханьне, адмаўленьне) раду літаратурных твораў (няма гэтага — няма літаратурнага працэсу — няма **літаратуры**, адно літаратурныя творы, рад твораў найвышэй).

#### Іншыя пагляды

2. Літаратура як расьціна. Адмаўленьне літаратурнага працэсу. Літаратура як нарост. Адмаўленьне разьвіцьця базы й надбудовы — адно зьмена базы, якая стылізуецца ў надбудове. Адмаўленьне шляху ад надбудовы да базы — ад літаратуры да сацыялягічнага эквіваленту — адно ад базы да надбудовы, ад сацыялёгіі да „літаратурнага эквіваленту“ (адмаўленьне навук пра надбудовы — пра літаратуру).

### [З трэцяй лекцыі, 29 траўня 1930 г.]

Твор як вынік працэсу (зьняты працэс) і пачатак новых працэсаў. Твор як выражэньне літаратурнага працэсу ў папярэчным разрэзе яго — як сярэдні тэрмін, у якім зьнятыя й абодвы крайнія (першы — аўтар — застаўся, зьняўся, трэйці — адтваральнік — дастаўся праз аўтара — як чытач, на якога аўтарава арыентацыя так ці іначай засьведчана ў творы; часам — як частковы суаўтар, калі толькі такі бывае — рэдактар, цэнзар, выдавец (заказчык). У наўздоўжным разрэзе. Твор як зьява мастацкай культуры. Твор як зьява сацыяльнай псыхалёгіі, ідэалёгіі. Твор як тэза, антытэза. Твор як „рэпліка“, адказ на пытаньне.

*[1930]*